Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ 1



ВЫДАВЕЦТВА
Аверсэв




**Чалавек і свет. 1 клас. Рабочы сшытак**

Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў

Матэрыял рабочага сшытка адпавядае патрабаванням вучэбнай праграмы і зместу вучэбнага дапаможніка «Чалавек і свет» для 1 класа. Сшытак уключае мноства рознаўзроўневых заданняў, якія пабудаваны на аснове ілюстрацыйнага матэрыялу.

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

**aversev.by**

Поўны каталог вучэбнай літаратуры, карысныя матэрыялы і спецыяльныя прапановы

Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае

МІНСК

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2023

Скачано с сайта www.aversev.by

УДК [502+3+613](075.2=161.3)
ББК 20.1.я71
Т65

Р э ц э н з е н т ы:

кандыдат педагагічных навук, дацэнт, намеснік дэкана па навуковай працы факультэта пачатковай адукацыі, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» *А. Г. Сарока*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 4 г. Гродна» (настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *А. П. Ланец*)

**ISBN 978-985-893-271-8**

© Трафімава Г. У., Трафімаў С. А., 2017
© Трафімава Г. У., Трафімаў С. А., 2023, са зьмяненнямі
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗМЕСТ


Наша Радзіма — Беларусь ........ 5

Што такое прырода ........ 8
Жывая і нежывая прырода ........ 10
Асеннія змяненні ў прыродзе і жыцці чалавека ........ 12
Змяненні ў нежывой прыродзе восенню ........ 14
Расліны — частка жывой прыроды. Жыццё раслін восенню ........ 16
Жыццё раслін восенню. Лістапад ........ 18
Жывёлы — частка жывой прыроды ........ 20
Жыццё жывёл восенню ........ 22
Свойская жывёла восенню. Праца людзей восенню ........ 24
Восень і здароўе чалавека ........ 26
Асеннія агародніна і садавіна — крыніца здароўя ........ 28
Асеннія з’явы ў прыродзе ........ 30
Праверце сябе ........ 32

Зімнія змяненні ў прыродзе і жыцці чалавека ........ 33
Змяненні ў нежывой прыродзе зімой ........ 34
Як зімуюць расліны ........ 36
Жыццё дзікіх жывёл зімой ........ 38
Жыццё птушак зімой ........ 40
Свойская жывёла зімой. Праца людзей зімой ........ 42
Зіма і здароўе чалавека ........ 44
Зімнія з’явы ў прыродзе ........ 46
Праверце сябе ........ 48

Чалавек і грамадства ........ 49
Мой горад (вёска) ........ 50
Я і мая сям’я ........ 52
Небяспечныя сітуацыі ў доме ........ 54
Праверце сябе ........ 56




Скачано с сайта www.aversev.by

Вясеннія змяненні ў прыродзе і жыцці чалавека ............ 57
Змяненні ў нежывой прыродзе вясной ............................ 58
Вясна і здароўе чалавека .................................................. 60
Вясна — час абуджэння раслін ........................................ 62
Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл вясной ........................... 64
Свойская жывёла вясной. Праца людзей вясной ............ 66
Вясеннія з'явы ў прыродзе ................................................ 68
Праверце сябе .................................................................... 70

Летнія змяненні ў прыродзе і жыцці чалавека ................ 71
Змяненні ў нежывой прыродзе і жыцці раслін летам .......... 72
Жыццё дзікіх жывёл і свойскай жывёлы летам ............. 74
Лета і здароўе чалавека .................................................... 76
Змяненні ў прыродзе і працы чалавека ў розныя
пory года ............................................................................ 78
Праверце сябе .................................................................... 80

**Умоўныя абазначэнні:**

 — адкажыце на пытанне;

 — праца ў парах (групах);

 — зрабіце самі;

 — паназірайце;

 — даведайцеся больш з кнігі для чытання «Чалавек і свет. 1 клас».


Скачано с сайта www.aversev.by

# НАША РАДЗІМА — БЕЛАРУСЬ

**?** Раскажыце, што вы ведаеце пра сваю краіну. Як называецца яе галоўны горад? Ці згодны вы з прыказкай: «Няма зямлі прыгажэй, чым Радзіма наша»? Патлумачце чаму.










Мы жывём у Рэспубліцы Беларусь. Гэта наша краіна, наша Радзіма. Беларусь — край лясоў, блакітных рэк і азёраў. У нашай краіне шмат прыгожых гарадоў і вёсак. Галоўны горад Беларусі, яе **сталіца**, называецца **Мінск**.



Скачано с сайта www.aversev.by

Абмяркуйце, што адлюстравана на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь. Як выглядае Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь?






Дзе вы бачылі герб і сцяг Рэспублікі Беларусь? Чаму да іх трэба ставіцца з павагай?






Разгледзьце малюнак. Як вы думаеце, гімн якой краіны гучыць на спартыўнай арэне?

**Герб**, **сцяг** і **гімн** — дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь. Іх трэба ведаць і паважаць.


Скачано с сайта www.aversev.by

# БЕЛАРУСЬ

с. 8–11

Разгледзьце фатаграфіі Мінска. Раскажыце, дзе вы хацелі б пабываць у сталіцы.




Плошча Перамогі



Нацыянальная бібліятэка



Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны




Беларускі дзяржаўны цырк



Станцыя метро



Мінск-Арэна

Што вы называеце сваёй малой радзімай? Раскажыце пра яе. Назавіце свой дамашні адрас і адрас сваёй школы.



Скачано с сайта www.aversev.by

Што адносіцца да прыроды, а што створана чалавекам?



АБ’ЕКТЫ ПРАЦЫ ЧАЛАВЕКА — ВЫРАБЫ



Раскажыце, якія вырабы вы сустракаеце па дарозе ў школу.

Зрабіце выраб з пластыліну ці паперы. Арганізуйце з аднакласнікамі выставу вашых работ.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРЫРОДА





АБ’ЕКТЫ ПРЫРОДЫ

Усё навокал, што не створана чалавекам, называюць **прыродай**.



Паглядзіце ў акно. Якія аб’екты прыроды вы бачыце?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫВАЯ І НЕЖЫВАЯ

Якіх жывёл вы бачыце на малюнках? А якія расліны? Што агульнага ў раслін і жывёл?



Жывёлы і расліны — **аб'екты жывой прыроды**. Яны нараджаюцца, дыхаюць, харчуюцца, растуць, пакідаюць патомства, паміраюць.

## СОНЦА — КРЫНІЦА СВЯТЛА І ЦЯПЛА



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРЫРОДА



**?** Падумайце, ці можна паветра і ваду аднесці да жывой прыроды. Патлумачце чаму.

Сонца, паветра, вада, камяні, пясок — **аб’екты нежывой прыроды**. Яны не могуць расці, дыхаць, харчавацца, пакідаць патомства, паміраць.

## ДЛЯ ЎСЯГО ЖЫВОГА НА ЗЯМЛІ.



Скачано с сайта www.aversev.by

? Разгледзьце схему. Назавіце поры года. Якая зараз пара года? Якая пара года была да яе? Якія месяцы года «схаваны» ў прыказцы: «Ад восені да лета павароту няма»?




Раскажыце, ці любіце вы восень. Чаму? Што вы хацелі б даведацца пра восень?


Скачано с сайта www.aversev.by

## ПРА ШТО ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ:

- што адбываецца восенню ў нежывой прыродзе;
- чаму восенню становіцца халадней;
- як змяняецца восенню жыццё раслін;
- як дзікія жывёлы рыхтуюцца да зімы;
- як змяняецца восенню жыццё свойскай жывёлы;
- чым карысны агародніна і садавіна;
- як прырода ўплывае на здароўе людзей;
- якой працай восенню займаюцца людзі.

## ЧАМУ ВЫ НАВУЧЫЦЕСЯ:

- назіраць за змяненнямі ў прыродзе і расказваць пра іх;
- тлумачыць, як звязаны змяненні ў нежывой і жывой прыродзе;
- пазнаваць дрэвы і кусты ў двары школы;
- адрозніваць хвойныя дрэвы ад ліставых;
- адрозніваць дзікіх жывёл і свойскую жывёлу;
- правільна апранацца для прагулак восенню;
- загартоўваць свой арганізм.



Скачано с сайта www.aversev.by

? Успомніце, што называюць прыродай. Што адносяць да нежывой прыроды?





Разгледзьце і параўнайце малюнкі. Якія змяненні адбываюцца ў нежывой прыродзе восенню? Чаму восенню становіцца халадней?

Восенню Сонца над зямлёй падымаецца не так высока, як летам. Дні становяцца карацейшымі. Зямля атрымлівае менш цяпла. Паветра становіцца халаднейшым. Ахалоджваюцца вада і глеба.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРЫРОДЗЕ ВОСЕННЮ

с. 22–23

Якія ападкі бываюць летам, а якія — восенню? Чым асеннія дажджы адрозніваюцца ад летніх? Абмяркуйце, якую карысць прыносіць дождж.



Дзе восенню вы бачылі туманы? Калі яны бываюць: раніцай, удзень, увечары? Што вы яшчэ пра іх ведаеце? Чаму ў тумане кіроўцы запальваюць фары?



У якім асеннім месяцы больш за ўсё туманаў?

Што восенню можна ўбачыць на лужынах у халоднае надвор'е раніцай? Што можна заўважыць на халоднай глебе і траве? З чым гэта звязана?

З'яўленне лёду на лужынах, іней на траве і глебе — прыкметы замаразкаў восенню.



Скачано с сайта www.aversev.by

# РАСЛІНЫ — ЧАСТКА ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ.

Чаму расліны адносяць да жывой прыроды? Ці могуць яны пражыць без нежывой прыроды? Чаму?





Як асенняе пахаладанне ўплывае на дрэвы, кусты, травяністыя расліны?

Восенню ў многіх дрэў і кустоў змяняецца афарбоўка лісця. Травяністыя расліны адцвітаюць, вянуць і паступова засыхаюць. У многіх раслін паспяваюць плады.


Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫЦЦЁ РАСЛІН ВОСЕННЮ

с. 24–26

Якія дрэвы, кусты, травяністыя расліны растуць у двары вашай школы? У якіх з іх восенню вы бачылі плады?

сойка





Як рассяляюцца плады і насенне ў прыродзе? Хто і што ім дапамагае?

шчаўе



ло́пух



Збярыце восенню на клумбах насенне кветак, каб пасеяць яго вясной. Падсушыце насенне гарбуза, дыні, кавуноў, кабачкоў для падкормкі птушак зімой.



Скачано с сайта www.aversev.by

**?** Раскажыце, чым прыгожая прырода восенню. Чаму змяняецца афарбоўка лісця дрэў і кустоў? У якіх з іх лісце ападае?







**?** Чым адрозніваецца лістапад у клёна, асіны, каштана? Выкажыце здагадку, чаму дрэвы восенню скідваюць лісце.



сасна



елка

Параўнайце на малюнку галіны сасны і елкі. Чым яны падобны? Чым адрозніваюцца? У чым іх адрозненне ад галін ліставых дрэў?

У ліставых дрэў лісце змяняе афарбоўку і ападае. У хвойных дрэў елкі і сасны лісты-іголкі (шыпулькі) восенню застаюцца зялёнымі.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ВОСЕННЮ. ЛІСТАПАД

с. 30–35

Параўнайце галінку лістоўніцы летам і восенню. Патлумачце, чаму гэта хвойнае дрэва так назвалі.





Ці ападае лісце ў бязветранае надвор'е? Ці ёсць ранкі ад апалага лісця на галінках дрэў?



**Лістапад** — ападанне лісця восенню. Ён дапамагае раслінам падрыхтавацца да зімы і пазбавіцца ад шкодных рэчываў, якія назапасіліся.

Састаўце букет з апалага лісця або зрабіце з бацькамі аплікацыю.





Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫВЁЛЫ — ЧАСТКА

Раскажыце, якіх жывёл вы сустракалі па дарозе ў школу. Назавіце жывёл на фатаграфіях. Каго з іх адносяць да звяроў, каго — да птушак? Якія рыбы адлюстраваны, а якія — насякомыя?


божая кароўка


воўк


карась


шчупак


лебедзь


конік

Абмяркуйце, якіх звяроў, птушак, рыб, насякомых вы яшчэ ведаеце.



Успомніце, па якіх прыкметах жывёл адносяць да жывой прыроды.

Звяры, птушкі, рыбы, насякомыя — гэта жывёлы. Яны дыхаюць, харчуюцца, растуць, размнажаюцца, паміраюць. Таму іх адносяць да жывой прыроды.


Скачано с сайта www.aversev.by

?

Разгледзьце малюнак. Хто схаваўся за плотам? Назавіце дзікіх жывёл і свойскую жывёлу на малюнку. Чым дзікія жывёлы адрозніваюцца ад свойскай?



**Дзікія жывёлы** самі здабываюць ежу, устройваюць жыллё, клапоцяцца пра патомства. Яны самі ратуюцца ад ворагаў і дрэннага надвор’я.

**Свойскай** называюць **жывёлу**, якую разводзяць людзі. Гэта жывёла жыве побач з чалавекам і прыносіць яму карысць. Людзі клапоцяцца пра яе ежу, жыллё, здароўе.



Скачано с сайта www.aversev.by

? Разгледзьце птушак на малюнках. Як вы думаеце, чаму іх падзялілі на дзве групы? Якія з іх адлятаюць ад нас восенню? Як называецца гэта група птушак?


журавель


салавей


дзяцел


варона


ластаўка


шэрая гусь


сарока


верабей

Раскажыце, якіх птушак, што адлятаюць, вы бачылі восенню ў прыродзе. Выкажыце здагадку, чаму гэтыя птушкі адлятаюць у вырай.

Восенню вянуць расліны, памяншаецца колькасць пладоў і насення. Прападаюць насякомыя: адны паміраюць, іншыя хаваюцца ў зацішных месцах. Птушкам становіцца цяжка здабываць корм. Таму пералётныя птушкі адлятаюць у вырай. Застаюцца птушкі, якія зімой змогуць знайсці сабе корм.


Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫВЁЛ ВОСЕННЮ

с. 36–40, 42

Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як восенню рыхтуюцца да зімы дзікія жывёлы.



З надыходам халадоў корму для дзікіх жывёл становіцца менш. Таму адны жывёлы робяць запасы ежы, іншыя — хаваюцца ў зацішных месцах і ўпадаюць у спячку.

Звяры восенню ліняюць, змяняючы летнюю рэдкую шэрсць на густую і пушыстую. У некаторых звяроў змяняецца і яе афарбоўка. У зайца-беляка яна становіцца белай, у вавёркі — шэрай.



Скачано с сайта www.aversev.by

# СВОЙСКАЯ ЖЫВЁЛА ВОСЕННЮ.

? Успомніце, якую жывёлу называюць свойскай. Хто з яе адлюстраваны на малюнках? Чаму людзі разводзяць свойскую жывёлу і клапоцяцца пра яе?



Свойская жывёла дае малако, яйкі, мяса, мёд, шэрсць, пух. Яна дапамагае людзям і радуе іх.

? Якіх жывёл можна яшчэ намаляваць?






Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ ВОСЕННЮ

Як змяняецца жыццё свойскай жывёлы восенню? Патлумачце, як гэта звязана са змяненнямі ў прыродзе.




Як вы думаеце, чаму свойская птушка не адлятае восенню ў цёплыя краі?








Якой працай восенню заняты дарослыя і дзеці? Чаму такую працу трэба рабіць у гэтую пару года? Як вы дапамагалі дарослым у асенняй працы?



Скачано с сайта www.aversev.by

? Раскажыце, чым падобны і чым адрозніваюцца гэтыя малюнкі. Па якіх прыкметах вы пазналі восень?









Чым карысныя прагулкі на свежым паветры восенню? Як змяняюцца адзенне і абутак людзей для прагулак у асеннюю пару?

Якое сёння надвор'е? Сонечнае? Пахмурнае? Цёплае? Халоднае? Дажджлівае? Ветранае?



Скачано с сайта www.aversev.by

Ці згодны вы з меркаваннем, што асенняе надвор'е ўплывае на здароўе людзей? Патлумачце свой адказ. Якія адзенне і абутак вы выбралі сёння? Чаму?

Раскажыце па малюнках, як дзеці загартоўвалі свой арганізм летам.





Што робяць дзеці для загартоўвання восенню? Што робіце вы?

Часцей гуляйце на свежым паветры. Выбірайце адзенне і абутак для прагулак у адпаведнасці з надвор'ем.

Для загартоўвання кожны дзень пасля зарадкі абцірайце цела вільготным ручніком. Калі прымаеце душ, чаргуйце цёплую і халаднаватую ваду.



Скачано с сайта www.aversev.by

Разгледзьце малюнкі. Што агульнага ў пладоў раслін?



Плады ўтвараюцца на месцы кветак. Унутры пладоў знаходзіцца насенне.

Гэта плады? Чаму?





У якіх раслін да восені паспяваюць ядомыя плады? Якія яшчэ расліны людзі вырошчваюць для ўжывання ў ежу?



Скачано с сайта www.aversev.by

с. 27–29

Падзяліце расліны на малюнку на агародніну і садавіну. Чым яны карысныя?









Пра якія правілы ўжывання агародніны і садавіны напамінаюць гэтыя малюнкі?

Прыгатуйце з бацькамі салату са свежай агародніны і садавіны.



Скачано с сайта www.aversev.by

Якая пара года паказана на малюнках? Па якіх прыкметах вы змаглі вызначыць раннюю, залатую і познюю восень?







Якія яшчэ змяненні ў нежывой і жывой прыродзе адбываюцца ў розныя перыяды восені?



Скачано с сайта www.aversev.by

# Ў ПРЫРОДЗЕ

с. 41–44

**?** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, як жывёлы восенню рыхтуюцца да зімы.













Разгледзьце малюнкі і назавіце птушак. Якія з іх застаюцца зімаваць у Беларусі? Якія птушкі адлятаюць? Патлумачце чаму.



шпак



верабей



сарока



дзяцел



жаваранак



ластаўка



дзікая качка

**?** Ці можна затрымаць пералётных птушак, калі развесіць для іх уцепленыя домікі?



Скачано с сайта www.aversev.by

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### ЦІ ПРАВІЛЬНА, ШТО...

- восенню  падымаецца невысока над зямлёй і дні становяцца карацейшымі?
- цёплы ліўневы  часцей бывае восенню, чым летам?
- восенню ўсе  змяняюць афарбоўку лісця?
- з дрэў восенню  ападаюць і ў бязветранае надвор'е?
- конь, каза,  — гэта свойская жывёла?
- недахоп корму прымушае пералётных  адлятаць восенню ў вырай?
- у  і іншых звяроў восенню адрастае густая і пушыстая шэрсць?
- попаўзень, сойка,  запасаюць корм на зіму?
- перад ужываннем у ежу агародніну і  можна не мыць?
- для здароўя карысна восенню гуляць і  на свежым паветры?


Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗІМНІЯ ЗМЯНЕННІ Ў ПРЫРОДЗЕ І ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА

## ПРА ШТО ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ:

- якія змяненні адбываюцца ў нежывой прыродзе зімой;
- якія сняжынкі падаюць з аблокаў на зямлю;
- як выглядаюць хвойныя і ліставыя дрэвы зімой;
- якія травяністыя расліны зімуюць з зялёнымі лістамі;
- як зімуюць розныя жывёлы;
- якой важнай працай заняты зімой людзі ў горадзе і вёсцы;
- як зімой трэба ахоўваць сваё здароўе.

## ЧАМУ ВЫ НАВУЧЫЦЕСЯ:

- расказваць аб змяненнях у прыродзе зімой і тлумачыць, з чым яны звязаны;
- даказваць з дапамогай доследаў, што снег і лёд — замёрзлая вада;
- распазнаваць дрэвы і кусты зімой;
- пазнаваць птушак, якія прыляцелі да кармушкі;
- выбіраць бяспечныя месцы для гульняў зімой;
- клапаціцца пра сваё здароўе і ўмацоўваць яго.


Скачано с сайта www.aversev.by

Пра які месяц года гавораць: «Году пачатак, зіме сярэдзіна»? Назавіце іншыя зімнія месяцы. Дакажыце свой адказ, выкарыстоўваючы малюнак на старонцы 12. Якія пачуцці ў вас выклікае прырода зімой?





Параўнайце малюнкі. Якія змяненні ў нежывой прыродзе адбываюцца з надыходам зімы? Чаму зімой халадней, чым восенню?

Сонца зімой у небе падымаецца невысока. Дні кароткія. Зямля атрымлівае мала цяпла. Паветра награваецца слаба, таму звычайна бывае марознае надвор'е. Глеба замярзае. Вадаёмы пакрываюцца лёдам. У час снегападаў з аблокаў на зямлю падае снег. Снегапад пры моцным ветры называюць мяцеліцай. У мяцеліцу каля дрэў, дамоў, платоў утвараюцца гурбы снегу.

Выкажыце здагадку, з чаго ўтвараюцца сняжынкі. Чаму снег выпадае зімой?


Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРЫРОДЗЕ ЗІМОЙ

с. 47–49

Разгледзьце малюнкі. Назавіце, якой формы могуць быць сняжынкі. Якія з іх вы бачылі ў прыродзе?



пласцінка



вожык



за́панка



зорка



слупок



іголка

Дзе сняжынкі растаюць хутчэй: на руцэ або паліто? Чаму? У якое надвор'е снег рыпіць пад нагамі? У марознае надвор'е або ў адлігу лягчэй зляпіць снежкі?

Разгледзьце малюнкі на форзацы. Праверце з дапамогай доследу, што снег — замёрзлая вада. Высветліце, ці чысты белы снег.



Зрабіце дослед. Дакажыце, што лёд — гэта замёрзлая вада.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЯК ЗІМУЮЦЬ

?

Успомніце, як па шыпульках і шышках можна адрозніць елку і сасну. Як вы думаеце, ці можна ліставыя дрэвы зімой адрозніваць адно ад аднаго? Па якіх прыкметах?



?

Выкажыце здагадку, як жывуць дрэвы зімой. Як яны засцерагаюцца ад холаду?

Дрэвы на зіму не паміраюць, а «засынаюць» да вясны. Іх можна адрозніваць па сілуэце, колеры кары, сухіх лістах і пладах на галінах.



Скачано с сайта www.aversev.by

# РАСЛІНЫ

с. 50–53

Разгледзьце малюнкі. Параўнайце галінкі з пупышкамі ў розных раслін. Раскажыце, як зімой пазнаць каліну і агрэст. Чым адрозніваюцца галінкі з пупышкамі ў таполі і асіны?




Вызначыце зімой па знешнім выглядзе дрэвы і кусты каля школы.

Раскажыце па малюнку, якія травяністыя расліны зімуюць з зялёнымі лістамі. Якія яшчэ вы бачылі? Чаму яны зімой не гінуць ад маразоў?






Скачано с сайта www.aversev.by



Раскажыце, якіх жывёл можна ўбачыць зімой у нашых лясах. Хто схаваўся ў «спаленьках», утоеных ад вачэй людзей? Чаму? Чым харчуюцца зімой дзікія звяры? Як людзі дапамагаюць лясным звярам зімой?

Параўнайце на малюнках сляды звяроў на снезе. Чаму сляды на снезе называюць «снежнай кнігай»?


лось


вавёрка


заяц


лясная мыш

Разгледзьце малюнкі. Назавіце жывёл, якія зімуюць у вадзе пад лёдам. Патлумачце, чаму людзі зімой робяць палонкі ў лёдзе.


Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫВЁЛ ЗІМОЙ

с. 56, 60–61



Пасля снегападаў звярам цяжка хадзіць па глыбокім снезе і адшукваць корм. Таму людзі іх падкормліваюць. У лесе раскладваюць сена і агародніну, развешваюць пучкі ліставых раслін.






Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫЦЦЁ ПТУШАК

? Успомніце, якія птушкі і чаму восенню адляцелі ў вырай. Раскажыце, якіх птушак вы бачылі зімой. Чым яны займаліся?


попаўзень


сарока


галка


сойка


варона


глушэц

Разгледзьце на фатаграфіях птушак, якія зімуюць. Апішыце іх знешні выгляд (колер галавы, спінкі, брушка, крылаў; кароткі або доўгі хвост, яго афарбоўка). Чаму гэтыя птушкі не адляцелі восенню?

Гэтыя птушкі не адляцелі восенню таму, што зімой у нашых краях знаходзяць сабе корм. Яны харчуюцца пладамі, насеннем, пупышкамі раслін. Птушкі адшукваюць у трэшчынах кары дрэў насякомых, якія схаваліся.


Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗІМОЙ

с. 68–71

Чаму птушкам зімой патрэбна дапамога людзей? Як можна дапамагчы птушкам, якія зімуюць?




Якія птушкі адлюстраваны каля кармушкі? Якія з іх прыляцелі на зімоўку? Які корм ядуць птушкі?



З дапамогай дарослых зрабіце кармушку і павесьце яе побач з домам. Насыпайце ў яе корм кожны дзень.

Навучыцеся вызначаць птушак каля кармушкі.



Скачано с сайта www.aversev.by

# СВОЙСКАЯ ЖЫВЁЛА ЗІМОЙ.

? Успомніце, якую жывёлу адносяць да свойскай. Якія змяненні адбываюцца ў яе жыцці зімой? Як гэта звязана са змяненнямі ў прыродзе? Як людзі клапоцяцца пра свойскую жывёлу зімой?



Зімой свойская жывёла жыве ў спецыяльных цёплых і сухіх памяшканнях. Людзі кормяць і даюць ваду жывёле. Яны клапоцяцца пра яе здароўе, чысцяць і выводзяць на прагулку.





Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, якімі відамі працы заняты людзі зімой. Чаму яны гэта робяць?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ ЗІМОЙ

с. 73



Зімой у дварах і на вуліцах прыбіраюць … . (Чаму?) На палях снег узворваюць і ўстанаўліваюць шчыты. (Навошта?) У садах снег атрасаюць з дрэў. (Для чаго?) У майстэрнях да вясенняга севу рамантуюць сеялкі, камбайны, … . (Што яшчэ?) У сховішчах для агародніны перабіраюць агародніну. (Навошта?) У цяпліцах зімой вырошчваюць кветкі і … . (Што яшчэ вырошчваюць?)



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗІМА І ЗДАРОЎЕ

?

Раскажыце, якое бывае надвор'е зімой. Ці ўплывае яно на настрой і здароўе чалавека? Чаму людзі зімой выбіраюць цёплае адзенне і абутак? Як яшчэ клапоцяцца пра здароўе і загартоўваюць арганізм?









Для загартоўвання зімой рабіце ранішнюю зарадку, абліванне, абціранне, праветрывайце пакой. Карысны прагулкі і гульні на вуліцы.



Скачано с сайта www.aversev.by

с. 74–75

Якія вы ведаеце зімнія гульні і забавы? Чым яны карысны? Ці заўсёды бяспечны зімнія гульні? Хто з дзяцей ставіць пад небяспеку сваё здароўе?





Чым небяспечны снегапад на дарогах? Як трэба пераходзіць вуліцу ў снегапад?



Чым небяспечна слізкая дарога? Што людзі робяць, каб не было слізка?



Разгледзьце малюнкі. Як вы думаеце, чым небяспечны пакрытыя лёдам вадаёмы?



Скачано с сайта www.aversev.by

**?** Як змяняецца ў зімнія месяцы вышыня Сонца над зямлёй? Як зімой змяняюцца ападкі, вадаёмы, глеба? Чаму гэта адбываецца?



**?** Чым важна снежнае покрыва на зямлі для жывёл і раслін?



**?** Разгледзьце малюнак. Палічыце колькасць светлых і цёмных пластоў снегу. Чаму яны чаргуюцца? Пра што могуць «расказаць» абломкі галінак, крылатае насенне ў пластах снегу?



Скачано с сайта www.aversev.by

# Ў ПРЫРОДЗЕ

с. 58, 62–66, 77

Успомніце, як зімуюць розныя расліны. Чаму рабіну і елку называюць прыроднымі кладоўкамі?




Раскажыце, якім жывёлам да смаку яловае насенне. Як пазнаць па шышках, хто над імі працаваў?




Разгледзьце малюнкі. У каго са звяроў дзень нараджэння заўсёды зімой? Якая птушка зімой уе гняздо? Якая рыба зімой кладзе ікру? Што вам вядома пра зімоўку іншых жывёл?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

## ЦІ ПРАВІЛЬНА, ШТО...

- з  выпадаюць сняжынкі рознай формы?
- снег на паліто растае хутчэй, чым на ?
- у марознае надвор’е ляпіць  цяжэй, чым у адлігу?
-  і лёд — гэта замёрзлая вада?
- зімой уся вада ў рэках ператвараецца ў лёд і   гінуць?
- дзьмухавец, сунічнік,  можна знайсці пад снегам зімой з зялёнымі лістамі?
- у  шыпулькі даўжэйшыя, чым у ?
- зімой    страшны не холад, а голад?
- зімой людзі трымаюць свойскую   у спецыяльных памяшканнях?
- зімой  апранаюцца цяплей, чым восенню?


Скачано с сайта www.aversev.by

# ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

## ПРА ШТО ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ:

- чым адрозніваюцца горад і вёска, чым яны падобны;
- якія месцы адпачынку ёсць у населеных пунктах;
- якія бываюць віды транспарту;
- што такое сям'я;
- навошта сям'я патрэбна чалавеку;
- якія правілы бяспечных паводзін трэба выконваць дома і на вуліцы.



## ЧАМУ ВЫ НАВУЧЫЦЕСЯ:

- расказваць пра свой населены пункт;
- пазнаваць галоўныя славутасці свайго населенага пункта;
- адрозніваць грузавы, пасажырскі, спецыяльны транспарт;
- расказваць пра сваю сям'ю;
- клапаціцца пра сваіх блізкіх;
- прытрымлівацца правіл бяспечных паводзін дома і на вуліцы;
- звяртацца па дапамогу ў выпадку небяспечных сітуацый у доме.



Скачано с сайта www.aversev.by

# МОЙ ГОРАД

? Разгледзьце малюнкі. На якім з іх адлюстраваны горад, на якім — вёска? Патлумачце, у чым падабенства і адрозненне горада і вёскі.






? Дзе вы жывяце — у горадзе або вёсцы? Як называецца ваш населены пункт? Ці ведаеце вы, чаму ён так названы? Чым ён вам дарагі? Раскажыце, дзе працуюць жыхары вашага горада або вёскі.

Падумайце, які транспарт можна сустрэць у горадзе, але нельга ўбачыць у вёсцы.


Скачано с сайта www.aversev.by

Разгледзьце схему і дапоўніце яе прыкладамі. Для чаго прызначаны кожны від транспарту?

Транспарт

пасажырскі — грузавы — спецыяльны


?


?


?

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, якіх правіл паводзін павінен прытрымлівацца пешаход.






Якія месцы для адпачынку ёсць у вашым населеным пункце?













Скачано с сайта www.aversev.by

**?** Раскажыце пра сям’ю на малюнку. Колькі ў ёй чалавек? Пакажыце і назавіце дарослых. Дзе тут бацькі, а дзе — дзеці? Хто малодшы — бабуля або мама? Хто старэйшы — тата або дзядуля?



Разгледзьце схемы. Абмяркуйце, хто так называе дзяцей у сям’і.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ? | → | дачка | → | | ← | сын | ← | ? |
| ? | → | унучка | → | | ← | унук | ← | ? |
| ? | → | сястра | → | | ← | брат | ← | ? |





Скачано с сайта www.aversev.by

# СЯМ'Я

**?** З кім вы жывяце? Раскажыце пра сваю сям'ю. Як завуць дарослых? Ці ёсць у вас сястра або брат? Хто з вас старэйшы? Як вы думаеце, навошта чалавеку сям'я?

**Сям'я** — гэта група блізкіх сваякоў, якія жывуць разам. У сям'і людзі клапоцяцца адзін аб адным. Яны ўдзельнічаюць у агульных сямейных справах. Разам праводзяць гадзіны адпачынку.














Якія дамашнія справы могуць выконваць у сям'і дзеці? Як вы дапамагаеце сваім блізкім у сям'і?



Скачано с сайта www.aversev.by

? Успомніце, навошта на ўроках працоўнага навучання вучаць прытрымлівацца правіл бяспечнай работы з інструментамі. На якім малюнку дзяўчынка правільна перадае нажніцы? Патлумачце чаму.





Разгледзьце малюнак. Знайдзіце на ім вырабы, якія пры неасцярожным выкарыстанні могуць стаць небяспечнымі.





Скачано с сайта www.aversev.by

# Ў ДОМЕ

Разгледзьце схемы. Раскажыце, як вы прапануеце запоўніць у іх пропускі.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
|  | → | 104 | → |  |
|  | → | ? | → |  |
| ? | → | 103 | → |  |
|  | → | 101 | → | ? |

Для хуткага выкліку дапамогі пры небяспечных сітуацыях у доме:

- набярыце неабходны нумар тэлефона;
- назавіце сваё імя і прозвішча, адрас, нумар тэлефона;
- скажыце, што адбылося і дзе;
- адкажыце на пытанні дзяжурнага;
- дакладна выконвайце тое, што скажа вам дзяжурны.

Прагаварыце з суседам па парце парадак дзеянняў пры выкліку экстраннай дапамогі ў розных небяспечных сітуацыях дома.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

## ЦІ ПРАВІЛЬНА, ШТО...

- на вуліцах вёсак шмат , ёсць тралейбусы, трамваі?
- парк, , Дом культуры — гэта месцы адпачынку людзей?
- метро, тралейбус,  адносяць да спецыяльнага транспарту?
- сям’я — гэта група добрых знаёмых?
- бабуля — гэта мама мамы або мама таты?
- у дружных сем’ях дарослыя дапамагаюць , а дзеці — дарослым?
- дзецям можна гуляць з запалкамі,  ?
- нельга пакідаць без нагляду ўключаны ?
- дзецям можна гуляць з , іголкамі і іншымі рэжучымі і колючымі інструментамі?
- калі на кухні здарылася ўцечка газу, то трэба тэлефанаваць па нумары **104**?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ВЯСЕННІЯ ЗМЯНЕННІ Ў ПРЫРОДЗЕ І ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА

## ПРА ШТО ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ:

- як вясной змяняецца нежывая прырода;
- дзе і чаму ўтвараюцца праталіны;
- што такое крыгаход і разводдзе;
- што адбываецца ў жыцці раслін вясной;
- як з надыходам вясны змяняецца жыццё дзікіх жывёл;
- якія змяненні адбываюцца ў жыцці свойскай жывёлы вясной;
- як і чаму змянілася праца людзей;
- як засцерагчы сябе вясной ад прастуды.

## ЧАМУ ВЫ НАВУЧЫЦЕСЯ:

- вызначаць прыкметы надыходу вясны ў прыродзе;
- тлумачыць, як звязаны змяненні ў нежывой і жывой прыродзе;
- пазнаваць раннеквітнеючыя травяністыя расліны;
- распазнаваць некаторых насякомых і птушак;
- выбіраць вясной адзенне і абутак для прагулак;
- выбіраць вясной бяспечныя месцы для гульняў;
- клапаціцца пра сваё здароўе вясной.



Скачано с сайта www.aversev.by

Разгледзьце малюнкі і параўнайце іх. Што змяняецца ў нежывой прыродзе з надыходам вясны? Дапоўніце расказ, выкарыстоўваючы малюнкі.





Вясной Сонца падымаецца ўсё вышэй над … . Яно свеціць даўжэй і грэе мацней. У сонечныя дні неба ярка-блакітнага, амаль сіняга … . Па небе плывуць белыя … . Пахмурных … мала. Снег выпадае рэдка. Затое дажджы ідуць … . Ад вясенняга цяпла растае … . Ручайкі, якія ўтварыліся, сцякаюць у рэкі, пранікаюць у …, якая адтала.

Паназірайце, які снег хутчэй растае — чысты або брудны.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРЫРОДЗЕ ВЯСНОЙ

с. 80

Дзе з’яўляюцца першыя праталіны? Чаму менавіта там? Як вы лічыце, чаму іх называюць праталінамі? Дзе можна бачыць ледзяшы? Выкажыце здагадку, з чаго і чаму яны ўтвараюцца.





Высветліце, вакол якіх дрэў (з цёмнай або светлай карой) праталіны большыя.





Абмяркуйце, дзе адлюстраваны крыгаход, а дзе — вясенні разліў рэк (разводдзе). З чым звязаны гэтыя змяненні на вадаёмах? Што надыходзіць раней? У чым іх небяспечнасць для людзей і жывёл?



Скачано с сайта www.aversev.by

Ці можна вясной прастудзіцца? Чаму? Як засцерагчы сябе ад прастуды?







Вясной працягвайце загартоўвацца. Гуляйце на свежым паветры. Каб не прастудзіцца, апранайце непрамакальнае ўцепленае адзенне і абутак.





Чаму кажуць, што ледзяшы растуць уніз галавой? Ці чысты лёд у ледзяшах? Чаму нельга іх аблізваць? Чаму ледзяшы збіваюць з дахаў?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗДАРОЎЕ ЧАЛАВЕКА

У якія гульні можна гуляць вясной у двары? Чаму кажуць: «Гульня — няхітрая штука, ды ў кожнай гульні навука»?



Чым адрозніваецца лёд на рацэ зімой і вясной? Якіх правіл бяспечных паводзін трэба прытрымлівацца каля ракі вясной?







Скачано с сайта www.aversev.by

# ВЯСНА — ЧАС

? Ці можна вясной пазнаць дрэвы, калі яны без лісця? Па якіх прыкметах?


алешына


чаромха


рабіна


каштан


дуб


клён

Што адбываецца вясной з пупышкамі дрэў і кустоў? Параўнайце свой адказ з тэкстам.





Вясной у дрэў і кустоў пачынаецца рух соку. На іх галінах набухаюць пупышкі і распускаюцца лісты. Многія дрэвы і кусты зацвітаюць.



Скачано с сайта www.aversev.by

# АБУДЖЭННЕ РАСЛІН

с. 81–88

? Разгледзьце малюнкі. Які куст зацвітае вясной першым? Якія дрэвы цвітуць ранняй вясной? З чым звязана ранняе цвіценне гэтых раслін?


арэшнік


алешына


вярба


асіна


падбел


сон-трава


першацвет


медуніца


пралеска


ветраніца

Якія травяністыя расліны цвітуць ранняй вясной? Якія пачуцці ў вас выклікае сустрэча з імі? Чаму да гэтых раслін трэба ставіцца беражліва?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗМЯНЕННІ Ў ЖЫЦЦІ ДЗІКІХ

? Назавіце жывёл на малюнках. Раскажыце, як змянілася іх жыццё з надыходам вясны.





З надыходам цяпла пачынаюць лётаць пчолы, чмялі, матылькі. Прачынаюцца вожыкі, мядзведзі, барсукі, жабы, змеі, яшчаркі. Усе звяры вясной ліняюць. У большасці жывёл з'яўляецца патомства.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫВЁЛ ВЯСНОЙ

с. 90–94, 96–98, 104

? Якая птушка першай вяртаецца вясной у нашы краі? Якія птушкі прылятаюць пазней? Чаму?



Якіх яшчэ птушак вы ведаеце? Калі яны прылятаюць? Як вы думаеце, чаму птушкі вясной пяюць?



каралёк



шпак



зязюля



зяблік



жаваранак

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, навошта птушкі ўюць гнёзды. Чым яны яшчэ заняты вясной? Чаму і як іх трэба ахоўваць у гэту пару года?



Скачано с сайта www.aversev.by

# СВОЙСКАЯ ЖЫВЁЛА ВЯСНОЙ.

**?** Разгледзьце малюнкі. Як змяняецца жыццё свойскай жывёлы вясной? Чаму яе сталі выводзіць на пашу?

















**?** Навошта вясной шпакі і галкі «катаюцца верхам» на каровах і конях?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ ВЯСНОЙ

с. 99

Чым вясной заняты людзі на палях, у садах, парніках, на вуліцах гарадоў і вёсак? Чаму гэта праца выконваецца вясной?



Чаму вясной людзі спяшаюцца своечасова пасеяць і высадзіць у глебу расліны?

Пасейце насенне кветак, якое вы восенню сабралі на клумбах.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ВЯСЕННІЯ З’ЯВЫ

Прачытайце. Замест пропускаў устаўце назвы вясенніх месяцаў. Дакажыце свой адказ, выкарыстоўваючы малюнак на старонцы 12. Назавіце іншыя прыкметы вясны ў прыродзе.

Першыя вясеннія праталіны і капеж. Гэта бывае ў … .

Бурнае раставанне снегу. Цвіценне першацветаў. Вылет чмялёў. Гэта бывае ў … .

Першыя клейкія лісты. Цвіценне дрэў у садах. Квітнеючыя ландыш і бэз. Гэта бывае ў … .



Разгледзьце малюнкі. Назавіце аб’екты нежывой і жывой прыроды. Якія змяненні з імі адбываюцца вясной?



Пазнайце па сілуэтах жывёл. Як змяняецца іх жыццё вясной?



Скачано с сайта www.aversev.by

с. 95, 100–103, 106

Прачытайце расказ і дапоўніце яго.

Вясной у родныя мясціны вяртаюцца пералётныя птушкі. (Дзе яны былі?)

Раней за ўсіх прылятаюць птушкі, якія могуць пракармiцца на праталінах. (Якія?)

Калі з вадаёмаў сыходзіць лёд, прылятаюць вадаплаўныя птушкі. (Хто гэта?)

Пазней за іншых з'яўляюцца птушкі, якія ловяць насякомых у паветры. (Хто гэта?)

Для выседжвання яек і выкормлівання птушанят птушкі ўстройваюць гнёзды на галінах, у дуплах дрэў. (Дзе яшчэ?)



Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, у якіх звяроў вясной з'яўляюцца дзіцяняты. У каго яшчэ з'яўляецца патомства? Як дарослыя жывёлы клапоцяцца пра сваё патомства?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

## ЦІ ПРАВІЛЬНА, ШТО...

- чым вышэй падымаецца  вясной, тым грэе мацней?
- чысты  растае хутчэй, чым брудны?
- праталіны вакол   са светлай карой большыя?
- лёд у  чысты і іх карысна есці для здароўя?
- першацвет і  цвітуць ранняй вясной?
- лісты вясной з'яўляюцца з  ?
- вясной прачынаюцца  і змеі?
- вясной першымі з птушак прылятаюць ?
- свойскую   людзі вясной выводзяць на пашу?
- вясной людзі спяшаюцца своечасова  у глебу расліны?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЛЕТНІЯ ЗМЯНЕННІ Ў ПРЫРОДЗЕ І ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА

## ПРА ШТО ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ:

- якія змяненні адбываюцца ў прыродзе летам;
- чаму лета — самая цёплая пара года;
- якія травяністыя расліны цвітуць летам;
- у якіх раслін летам паспяваюць ягады;
- як жывуць летам дзікія жывёлы і свойская жывёла;
- што рабіць для загартоўвання арганізма летам;
- як трэба паводзіць сябе ў лесе, на лузе, каля вадаёма;
- якой працай заняты летам людзі.

## ЧАМУ ВЫ НАВУЧЫЦЕСЯ:

- расказваць пра свае назіранні;
- тлумачыць, як звязаны змяненні ў нежывой і жывой прыродзе;
- пазнаваць некаторыя квітнеючыя расліны;
- адрозніваць ядомыя ягады ад неядомых;
- прытрымлівацца правіл бяспечных паводзін у прыродзе летам;
- прытрымлівацца правіл аховы прыроды;
- тлумачыць, чаму важна прытрымлівацца правіл аховы прыроды.



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗМЯНЕННІ Ў НЕЖЫВОЙ ПРЫРОДЗЕ

Прачытайце словы. Знайдзіце назвы летніх месяцаў. Назавіце іх па парадку. Якія з іх лічаць шостым у годзе і абазначаюць 06? Дакажыце свой адказ, выкарыстоўваючы малюнак на старонцы 12.

ЛЕТА ЗАГАР ЦЯПЛО ЛІПЕНЬ
ЖНІВЕНЬ КВЕТКІ ВЯСЁЛКА СПЯКОТА
ДУХАТА ЛІВЕНЬ КУПАННЕ ЧЭРВЕНЬ
НАВАЛЬНІЦА ПРАХАЛОДА ВЕЦЯРОК

Абмяркуйце, чаму лета — самая цёплая пара года. Што яшчэ адбываецца ў нежывой прыродзе летам? Якія пачуцці ў вас выклікае прыгажосць прыроды летам?




Якія з гэтых травяністых раслін вы бачылі ў прыродзе? Якія яшчэ расліны цвітуць летам?


Скачано с сайта www.aversev.by

# І ЖЫЦЦІ РАСЛІН ЛЕТАМ

с. 106–116, 126

У якіх раслін летам паспяваюць ягады? Якія ягады можна збіраць летам? Чым яны карысныя?

## ЯДОМЫЯ ЯГАДЫ


агрэст


чарніцы


буякі


брусніцы


чорныя парэчкі

## НЕЯДОМЫЯ ЯГАДЫ


бружмель лясны


ландыш


паслён чорны


мудранка


беладонна

Як вы думаеце, ці можна ягады назваць пладамі? Дакажыце свой адказ.

Якія дрэвы і кусты цвітуць летам?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЖЫЦЦЁ ДЗІКІХ ЖЫВЁЛ

? Якія дзікія жывёлы адлюстраваны на малюнках? Як дарослыя клапоцяцца пра птушанят і дзіцянят?













? Раскажыце пра жыццё іншых птушак і звяроў летам. Чым заняты летам насякомыя, рыбы, жабы, яшчаркі?



Скачано с сайта www.aversev.by

# І СВОЙСКАЙ ЖЫВЁЛЫ ЛЕТАМ

*с. 118–124*

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, як людзі клапоцяцца пра свойскую жывёлу летам. Якую дапамогу дарослым могуць аказаць дзеці?





Раскажыце па малюнках аб правілах паводзін у прыродзе. Пра якія правілы напамінаюць малюнкі на форзацы? Чаму іх трэба прытрымлівацца?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ЛЕТА І ЗДАРОЎЕ

Раскажыце, за што вы любіце лета. Як вы летам клапоціцеся пра сваё здароўе?



Раскажыце па малюнку, што летам робяць дзеці для загартоўвання арганізма. Якія правілы бяспечных паводзін парушаюць некаторыя з іх?

Прагулкі на свежым паветры летам умацоўваюць здароўе. Карысна хадзіць басанож, купацца і загараць. Купайцеся толькі разам з дарослымі. Загараць лепш з 10 да 12 гадзін. Пачынайце загараць з 5—10 хвілін, паступова павялічваючы час.


Скачано с сайта www.aversev.by

с. 127–129

Разгледзьце малюнкі. Складзіце правілы бяспечных паводзін летам на прыродзе.















Скачано с сайта www.aversev.by

# ЗМЯНЕННІ Ў ПРЫРОДЗЕ І ПРАЦЫ

? Разгледзьце і параўнайце малюнкі. Як у садах людзі даглядаюць расліны ў розныя поры года?



Якую яшчэ працу людзі выконваюць у садах на працягу года? Чаму важна гэта рабіць?



Скачано с сайта www.aversev.by

## ЧАЛАВЕКА Ў РОЗНЫЯ ПОРЫ ГОДА

Разгледзьце малюнкі. Як дзеці дапамагаюць дарослым на палях, агародах, вуліцах гарадоў і вёсак у розныя поры года?








? У якой працы вы дапамагалі дарослым у розныя поры года? Што вам асабліва падабаецца рабіць?



Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

## ЦІ ПРАВІЛЬНА, ШТО...

- плот, , ліхтар адносяцца да нежывой прыроды?
- рабіна і  — аб'екты жывой прыроды?
- птушка, матылёк,  — гэта жывёлы?
- дзікімі называюць жывёл, якіх даглядае  ?
- восенню ўсе дрэвы на зіму скідваюць   ?
- галка, , варона — гэта зімуючыя птушкі?
- капеж, цвіценне дрэў, прылёт  — прыкметы вясны?
- летам  высока падымаецца над зямлёй, дні доўгія?
- летнія месяцы — гэта сакавік, красавік, май?
- у чарніц, агрэсту,  ядомыя ягады?
- для здароўя карысна гуляць на свежым паветры ў любую пару года?
- пры пажары трэба тэлефанаваць па нумары **101**?



Скачано с сайта www.aversev.by

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Трафімава** Галіна Уладзіміраўна
**Трафімаў** Сяргей Анатольевіч

**ЧАЛАВЕК І СВЕТ**

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *К. А. Сакалоўская*
Вокладка мастака *М. А. Рацько*
Мастакі *М. А. Рацько, А. А. Тукач*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Музычэнка*
Камп'ютарная вёрстка *Я. І. Архіпавай*
Карэктары *Г. М. Мазіна, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 09.03.2023. Фармат 60×84 $^1/_8$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк 9,3. Ул.-выд. арк. 8,7. Тыраж 12 307 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск


Скачано с сайта www.aversev.by

## ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН НА ЭКСКУРСІІ



1 Бяром неабходныя прадметы.



2 Ідзём парамі. Можам няголасна гаварыць.



3 Слухаем настаўніка і выконваем заданні.



4 Памятаем пра бяспеку. Ахоўваем прыроду.

## ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН ПРЫ ВЫКОНВАННІ ДОСЛЕДАЎ



1 Бяром неабходнае для выконвання доследу.



2 Выконваем дослед і назіраем, што адбываецца.



3 Няголасна абмяркоўваем вынікі доследу.



4 Паведамляем настаўніку аб заканчэнні работы.

Скачано с сайта www.aversev.by

# ПРАВІЛЫ ЮНЫХ СЯБРОЎ ПРЫРОДЫ



Скачано с сайта www.aversev.by